(ознакомительный фрагмент)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 351.746.1 (476) (091)

Бусько
Сяргей Іванавіч

# ПАЛІТЫЧНАЯ ПАЛІЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ: СТВАРЭННЕ, СТРУКТУРА, ДЗЕЙНАСЦЬ (1898 – САКАВІК 1917 ГГ.).

**Аўтарэферат**
**дысертацыі на суісканне вучонай ступені**
**кандыдата гістарычных навук**
**па спецыяльнасці 07.00.02. – айчынная гісторыя**

**Мінск, 2011**

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Коршук Уладзімір Канстанцінавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| Афіцыйныя апаненты | **Забаўскі Мікалай Міхайлавіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэту УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка» |
| | **Яцкевіч Ігар Георгіевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прарэктар па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце УА «Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва» |
| Апаніруючая арганізацыя | **УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы»** |

Абарона адбудзецца « 13 » снежня 2011 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407.
Тэлефон вучонага сакратара: (8–017) 227–45–11.
e-mail: menkovski@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Аўтарэферат разасланы « 9 » лістапада 2011 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук, прафесар — В.І. Менькоўскі

# УВОДЗІНЫ

Вывучаючы гісторыю Беларусі ў кантэксце нацыятворчых і дзяржаўна-палітычных працэсаў XIX – XX ст. нельга ўявіць рэальнае жыццё краіны ў гэты час без ведання гісторыі дзяржаўных установ. Даследаванне розных структур палітычнай паліцыі, іх стварэння, метадаў, спецыфікі ў беларускіх губернях з'яўляецца неабходным для разумення заканамернасцяў і асаблівасцяў развіцця краіны ў эпоху палітычных, сацыяльных, эканамічных змен на мяжы XIX–XX стст.

Пад палітычнай паліцыяй разумеецца сістэма адміністратыўных органаў дзяржаўнай бяспекі, якая займаецца палітычным вышукам, забяспечвае ахову існуючай формы ўлады з дапамогай спецыяльных метадаў. Аб'ектыўны погляд на ролю палітычнай паліцыі ў грамадска-палітычным развіцці, станаўленні палітычных партый, фарміраванні парламенцкіх традыцый, беларускім нацыянальным руху, цэнзуры ў мастацтве немагчымы без аналізу перадумоў і прычын узнікнення жандарскіх упраўленняў, ахоўных аддзяленняў, крапасных жандарскіх каманд, вызначэння метадаў і асаблівасцяў іх дзейнасці на тэрыторыі Беларусі.

Пасля адмены прыгоннага права пачалося інтэнсіўнае развіццё эканомікі, якое суправаджалася сацыяльнымі і палітычнымі зменамі. Павелічэнне колькасці прадпрыемстваў, пашырэнне чыгуначнай сеткі, развіццё нацыянальных рухаў, інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі, урбанізацыя прадвызначылі ўзрастанне грамадскай напружанасці, а значыць і павелічэнне ролі палітычнай паліцыі. Узніклі складанасці з кантролем над яўрэйскім насельніцтвам – асноўнай базай для антыўрадавых арганізацый у канцы XIX ст.

Органы ўлады на мяжы стагоддзяў паступова губляюць мабільнасць: са спазненнем ацэньваюць і аналізуюць свае памылкі, марудна выпраўляюць іх, дэманструюць няздольнасць да палітычнага прагнозу як ў тактычным, так і стратэгічным плане. У дадзеным даследаванні асаблівая ўвага нададзена тром накірункам развіцця палітычнага кантролю над грамадствам: рэарганізацыі ўжо існаваўшых структур Дэпартамента паліцыі на месцах і павелічэнні іх эфектыўнасці (спецыялізацыя і пераразмеркаванне абавязкаў), стварэнні новых адзінак Дэпартамента (ахоўныя пункты, раённыя ахоўныя аддзяленні), лакальным эксперыментам па пошуку шляхоў вырашэння грамадскіх праблем («паліцэйскі сацыялізм»). Адначасовай палёгкай для жандармаў была адсутнасць вышэйшых навучальных установ і земстваў у беларускіх губернях.

Храналагічныя рамкі ахопліваюць час ад стварэння ў Дэпартаменце паліцыі Асобага Аддзела, на які ўскладаліся задачы па арганізацыі палітычнага вышуку, да ліквідацыі Дэпартамента паліцыі дэкрэтам Часовага ўрада ад 10 сакавіка 1917 г. Навізна даследавання заключаецца ў вывучэнні палітычнай

паліцыі як сістэмы, вылучэнні этапаў развіцця, накірункаў дзейнасці правінцыяльных устаноў палітычнага вышуку, вызначэнні іх ролі ў грамадска-палітычным развіцці беларускіх губерняў. У дысертацыі ўпершыню комплексна разгледжана палітычная паліцыя ў Беларусі, акрэслены яе характэрныя мясцовыя асаблівасці ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі рэгіёнамі, уласцівыя ёй метады дзейнасці, даследаваны сацыяльны і прафесійны склад супрацоўнікаў, іх колькасць і матывы дзейнасці, разгледжаны ўскосныя грамадскія функцыі жандарскіх устаноў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Тэма дысертацыі зацверджана Вучоным саветам гістарычнага факультэта БДУ (пратакол № 3 ад 23 снежня 2008 г.), удакладнена на паседжанні Савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры БДУ 27 кастрычніка 2011 г. (пратакол № 17). Дысертацыйная праца падрыхтавана ў межах Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» («Гісторыя і культура»), задання «Палітычныя партыі Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 2061332), якое выконвалася на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ ў 2006–2010 гг.

### Мэта і задачы даследавання

***Мэтай*** дысертацыйнай работы з'яўляецца выява прычын стварэння, раскрыццё структуры, камплектавання, асноўных накірункаў і метадаў дзейнасці органаў палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў 1898 – сакавіку 1917 гг.

У межах сфармуляванай мэты вызначаны наступныя ***задачы***:

1. разгледзець арганізацыйна-функцыянальную структуру ўстаноў палітычнага вышуку ў беларускіх губернях;

2. раскрыць працэс камплектавання асабовага складу, сацыяльную абарону супрацоўнікаў палітычнай паліцыі, падрыхтаванасць да выканання службовых абавязкаў, колькасныя і асабовыя характарыстыкі;

3. выявіць асноўныя накірункі і асаблівасці палітычнага вышуку ў супрацьдзеянні рэвалюцыйнаму руху ў беларускіх губернях ў кантэксце значных сацыяльна-палітычных узрушэнняў;

4. даследаваць метады кантролю за грамадскім рухам (у тым ліку за

сялянскімі выступленнямі, агітацыяй у арміі, выбарамі ў Дзяржаўную Думу, беларускім нацыянальным рухам), вызначыць іх адпаведнасць заканадаўству і эвалюцыю на працягу 1898 – сакавіка 1917 гг.;

5. прааналізаваць змест, ажыццяўленне і вынікі праектаў Дэпартамента паліцыі па падпарадкаванню рабочых арганізацый у беларускіх губернях напярэдадні Першай расійскай рэвалюцыі;

6. высветліць ролю і месца палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях у сістэме палітычнага вышуку ў параўнанні з нацыянальнымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

У сваёй сукупнасці пастаўленыя аўтарам задачы былі заклікананы стварыць цэльнае, комплекснае даследаванне гісторыі мясцовых органаў палітычнай паліцыі на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў і тым самым запоўніць істотны прабел у айчыннай гістарыяграфіі дадзенага перыяду.

***Аб'ект*** даследавання – сістэма органаў палітычнага вышуку Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. ***Прадмет*** – арганізацыйная структура, накірункі дзейнасці і метады працы палітычнай паліцыі ў Віленскай, Гродзенскай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях (адпаведна адміністрацыйнаму падзелу) у 1898 – сакавіку 1917 гг. Дысертацыя ахоплівае перыяд 1898 – сакавік 1917 гг. Ніжняя мяжа *храналагічных рамак* (1898 г.) вызначаецца стварэннем у Дэпартаменце паліцыі Асобага Аддзела, на які ўскладалася задача па арганізацыі палітычнага кантролю над грамадскім рухам. Верхнюю мяжу вызначае ліквідацыя Дэпартамента паліцыі і яго структур дэкрэтам Часовага ўрада ад 10 сакавіка 1917 г. З мэтай больш поўнага раскрыцця асобных важных тэматычных пытанняў даследавання аўтарам дапускаўся выхад за пазначаныя храналагічныя межы.

**Палажэнні, вынесеныя на абарону.**

На працягу 1898 – сакавіка 1917 гг. на тэрыторыі беларускіх губерняў фарміравалася эфектыўная структура органаў палітычнай паліцыі. Да 1905–1906 гг. рэформы Дэпартамента паліцыі былі рэакцыяй на рэвалюцыйны рух, але з 1907 г. развіццё ўстаноў палітычнага вышуку накіравана на папярэджванне антыўрадавых выступленняў. У гэты час склалася аптымальная сістэма палітычнага вышуку ў Беларусі: 70 унтэр-афіцэрскіх жандарскіх пунктаў – 16 павятовых жандарскіх упраўленняў – пяць губернскіх жандарскіх упраўленняў – Паўночна-Заходняе Раённае ахоўнае аддзяленне – Асобны Корпус жандараў. Для забеспячэння асобных функцый палітычнай паліцыі ў стратэгічных кропках беларускіх губерняў існавалі жандарска-паліцэйскія ўпраўленні на чыгунцы, чатыры крапасныя жандарскія каманды (Асавец, Дзвінск, Брэст, Гродна), контрразведвальнае аддзяленне і гарадскія ахоўныя аддзяленні ў Беластоку і Вільні.

2. Палітычная паліцыя камплектавалася лепшымі афіцэрамі ўсіх відаў войскаў пасля дэталёвага адбору. Жорсткія правілы адбору (у тым ліку забарона службы для каталікоў) сур'ёзна абмежавалі колькасць прадстаўнікоў з беларускіх губерняў у палітычнай паліцыі Расійскай імперыі. Служба ў структурах Асобнага Корпусу жандараў лічылася прэстыжнай, давала значныя матэрыяльныя і сацыяльныя перавагі ў параўнанні з астатнімі відамі войск. На жандараў распаўсюджваліся правы сацыяльнай абароны: пенсіі па ўзросту, забеспячэнне жыллём, узнагароджанні «вне правил». Аднак прафесійная падрыхтоўка ў большасці выпадкаў была невысокая. Істотнай праблемай стала нешматлікасць асабовага складу, якая дазваляла вырашыць пастаўленыя дзяржавай задачы толькі ў мірны час, калі прыкладна 1,5 тысячы чалавек забяспечвалі палітычны паліцэйскі нагляд за насельніцтвам пяці губерняў.

3. Напрамкі дзейнасці ўстаноў палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях не былі аднолькавымі на працягу разглядаемага перыяду і мелі мясцовую спецыфіку. За 1898 – сакавік 1917 гг. двойчы змяняўся асноўны аб'ект палітычнага вышуку: на мяжы стагоддзяў яго аб'ектам сталі не праявы тэрору, а палітычныя партыі і арганізаваны рабочы рух; а ў сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны асноўнай задачай была вызначана барацьба са шпіянажам. У пачатку XX ст. аб'ектам назірання палітычнай паліцыі Расійскай імперыі стаў і беларускі нацыянальны рух. Першапачаткова ён разглядаўся як частка польскага нацыянальна-вызваленчага альбо агульнарасійскага сацыялістычнага руху. Аднак кантроль нават за дробнымі праявамі антыўрадавай дзейнасці Беларускай сацыялістычнай Грамады быў выдатна арганізаваны, асабліва з 1907 г., бо пасля заканчэння Першай расійскай рэвалюцыі жандары атрымалі магчымасць больш увагі надаваць дробным нацыянальным партыям. Беларуская сацыялістычная Грамада ў 1908–1914 гг. як палітычная адзінка амаль не функцыянавала, а беларускі нацыянальны рух набыў легальныя формы (газета «Наша Ніва»). Пасля заканчэння Першай расійскай рэвалюцыі ўстановы палітычнай паліцыі атрымалі магчымасць пашырыць напрамкі сваёй дзейнасці і звярнуць увагу на прафсаюзы рух, мастацтва, рэлігійныя секты. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915-1917 гг. вылучылі спецыфічныя задачы па забеспячэнні працы ваеннай цэнзуры, мабілізацыі, эвакуацыі, барацьбе з чуткамі і дэзерцірствам.

4. У канцы XIX ст. сістэмы спецыяльных метадаў вышуку не існавала, а асноўная ўвага надавалася арганізацыі знешняга філерскага назірання і паліцэйскага нагляду. З 1900-х гг. асноўным метадам стала выкарыстанне ўнутранай агентуры, якое дасягнула піку свайго развіцця ў 1910–1912 гг. і дазволіла амаль цалкам ліквідаваць рэвалюцыйныя арганізацыі ў Расійскай імперыі, у тым ліку і ў беларускіх губернях. Адмова ад шырокага ўжывання сакрэтных супрацоўнікаў у 1913 г., забарона агентуры ў сістэме адукацыі і арміі

паслабіла пазіцыі органаў палітычнай паліцыі ў барацьбе з антыўрадавым рухам. У перыяды грамадскай напружанасці жандары звярталіся да незаконных метадаў дзейнасці (перлюстрацыя, ваенна-палявыя суды, беспадстаўныя вобыскі, правакацыя, падтрымка правых партый і пагромнага руху). Выдатна праявілі свае магчымасці жандарскія ўпраўленні і ахоўныя аддзяленні падчас парламенцкіх выбараў. З дапамогай незаконных метадаў (арышты выбаршчыкаў, матэрыяльная і інфармацыйная дапамога прадстаўнікам праўрадавых партый) яны забяспечылі абранне ў Дзяржаўныя Думы І-ІV скліканняў неабходных кандыдатаў.

5. Беларускія губерні вызначаліся ў складзе Расійскай імперыі наяўнасцю арганізаванага раменага, пераважна яўрэйскага руху, які праявіўся раней, чым у цэнтральных раёнах царскай Расіі. Няздольнасць мясцовага жандарскага кіраўніцтва вырашыць гэту праблему прымусіла Дэпартамент паліцыі да распрацоўкі новых метадаў і іх праверкі ў Паўночна-Заходнім краі. Якасна новай спробай вырашыць праблему супрацьстаяння рабочых і ўрада мірным шляхам стаў праект кіраўніка Маскоўскага ахоўнага аддзялення С.В. Зубатава. «Паліцэйскі сацыялізм», падтрымка сіяніцкіх арганізацый разам са станоўчым стаўленем да іх губернскай адміністрацыі далі выдатныя вынікі і раскалолі яўрэйскі антыўрадавы рух у Беларусі. Аднак з-за асабістай пазіцыі главы Дэпартамента паліцыі В. фон Плеве эксперымент быў спынены. Правал зубатаўшчыны пакінуў рабочае пытанне нявырашаным і паспрыяў пачатку Першай расійскай рэвалюцыі.

6. Дзейнасць палітычнай паліцыі ў Беларусі мела шэраг спецыфічных рыс, не характэрных для цэнтральнай часткі Расійскай імперыі. Наяўнасць мяжы ставіла пытанні па барацьбе з эміграцыяй, шпіянажам і кантрабандай нелегальнай літаратуры і зброі. Прыналежнасць значнай часткі беларускага грамадства да польскай і яўрэйскай нацый, канфесійная неаднароднасць зрабілі актуальным праблему палітычнай лаяльнасці мясцовага насельніцтва да ўрада, папярэджанне сацыяльных канфліктаў на міжнацыянальнай глебе. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1917 гг. вылучылі спецыфічныя задачы па забеспячэнню працы ваеннай цэнзуры, мабілізацыі, эвакуацыі, барацьбе з чуткамі і дэзерцірствам. Аднак на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стст. дзейнічала *расійская* палітычная паліцыя, якая, у значнай ступені з-за ідэалагічных прычын, не ўлічвала ў сваёй дзейнасці мясцовую спецыфіку: у тым ліку пры арганізацыі і камплектаванні мясцовых жандарскіх упраўленняў, распрацоўцы мерапрыемстваў па палітычнаму кантролю за грамадствам. Палітычная паліцыя ў беларускіх губернях у пачатку XX ст. з'яўлялася толькі *інструментам* рэалізацыі ўрадавай палітыкі і не мела самастойнага статусу як адпаведныя структуры ў Каралеўстве Польскім, Фінляндыі ці на Каўказе.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае аўтарскае даследаванне, падрыхтаванае на падставе вывучэння і аналізу шырокага кола архіўных крыніц Беларусі, Літвы, Расіі і навуковай літаратуры па дадзенай тэме. Большасць матэрыялаў уведзена ў навуковы зварот упершыню. У дысертацыйным даследаванні дэталёва вывучаны працэс фарміравання сістэмы палітычнага вышуку ў беларускіх губернях, прааналізавана эвалюцыя метадаў палітычнай паліцыі па арганізацыі кантролю над грамадствам. Дысертантам вызначаны напрамкі і асаблівасці функцыянавання палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях у канцы XIX – пачатку XX ст., яе месца і роля ў сістэме сілавых органаў Расійскай імперыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыі былі прадстаўлены на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: II міжнародная навуковая канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвечаная памяці прафесара В.У. Мелішкевіча «Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае» (Брэст, 12–13 лістапада 2004 г.); «НИРС–2005» (Мінск, 25–26 мая 2005 г.); «I Машеровские чтения» (Віцебск, 5 мая 2005 г.); «Шевченковская весна» (Кіеў, 2–3 сакавіка 2006 г.); «Инновации – 2006» (Мазыр, 25 красавіка 2006 г.); «Шевченковская весна. Современное состояние науки: достижения, проблемы и перспективы развития» (Кіеў, 1–2 сакавіка 2007 г.); «Романовские чтения-IV» (Магілёў, 22–23 лістапада 2007 г.); «Проблемы борьбы с преступностью и подготовки кадров для органов внутренних дел Республики Беларусь» (Мінск, 30 чэрвеня 2010 г.); «Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі», прысвечанай 90-годдзю са дня нараджэння І.А. Юхо (Мінск, 18–19 сакавіка 2011 г.); «Взаимодействие и взаимосвязь Днепровского Левобережья и Курского Посеймья (археология, история, современность)» (Глухаў, 9–10 чэрвеня 2011 г.),«Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» (Мінск, 7 красавіка 2011 г.); «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць» (Магілёў, 29–30 чэрвеня 2011 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання змешчаны ў 15 публікацыях, у тым ліку ў навуковых артыкулах, адзінаццаці дакладах у зборніках матэрыялаў канферэнцый і тэзісах выступленняў на навукова-практычных канферэнцыях. Чатыры публікацыі надрукаваны ў навуковых выданнях, унесеных у «Спіс навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь». Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,5 аўтарскія аркушы (навуковыя артыкулы – 2,1).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі абумоўлена мэтай і задачамі даследавання. Дысертацыйная работа складаецца з пераліку ўмоўных адзнак, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, уключаючай 3 главы, заключэння, бібліяграфічнага спісу (416 найменняў, з іх 15 – публікацыі аўтара) і 1 дадатку. Аб'ём дысертацыі без бібліяграфічнага спіса – 115 старонак, спіс – 33 старонкі, дадатак займае 5 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Асноўная частка дысертацыі ўключае тры главы. **Глава 1 «Гістарыяграфія праблемы, крыніцы, метады і метадалогія даследавання»** складаецца з трох раздзелаў. У раздзеле 1.1 *«Гістарыяграфія праблемы»* праведзены аналіз работ па тэматыцы даследавання.

Цікавасць да асноўных інстытутаў палітычнай паліцыі ў Расійскай імперыі мела месца як у айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. Першымі спробамі вывучэння дадзенай праблемы сталі работы супрацоўнікаў Дэпартамента паліцыі (ДП) і Міністэрства юстыцыі[1]. У дарэвалюцыйны перыяд пытанні структуры і дзейнасці мясцовых устаноў палітычнага вышуку закраналіся толькі ў самым агульным выглядзе. Каштоўнасць гэтых прац заключаецца ў змешчаным у іх фактагічным матэрыяле па беларускіх губернях, а таксама ў спробе прааналізаваць тыя працэсы і тэндэнцыі, удзельнікамі і стваральнікамі якіх яны і з'яўляліся. Адразу пасля лютаўскіх падзей 1917 г. пачынаецца новы этап ў вывучэнні органаў палітычнай паліцыі. Было створана некалькі камісій: Камісія па разбору спраў Дэпартамента паліцыі, Надзвычайная следчая камісія Часовага ўраду. У такіх умовах з'явілася магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі губернскіх жандарскіх упраўленняў (ГЖУ), ахоўных аддзяленняў, Асобага Аддзелу ДП, як вынік, пачалося выданне кніг, якія раскрывалі таямніцы жандараў і паліцыі[2]. Іх працы прысвечаны замежнай агентуры, дзейнасці ахоўных аддзяленняў, сакрэтнай агентуры, аналізу метадаў і прыёмаў ахранкі, надаецца ўвага правакацыйнай дзейнасці Дэпартаменту паліцыі, прычым частка прац друкуецца ўжо ў 1917–1922 гг. Аднак, з улікам адной з іх галоўных мэт – дыскрэдытацыі царскага ўраду, навуковы ўзровень дадзеных прац не вельмі

---

[1] .Лопухин, А.А. Из итогов служебного опыта. Настоящее и будущее русской полиции / А.А. Лопухин. – М.: изд-во В. Саблина, 1907. – 70 с.; Дерюжинский, В.Ф. Полицейское право / В.Ф. Дерюжинский. – СПб.: Сенат. типография, 1903. – 499 с.; Обязанности жандармской железнодорожной полиции. По жандармско-полицейской части / сост. Л. Тимофеев. – 2-е изд. – СПб.: Типография МВД, 1912. – 912 с.

[2] Жилинский, В.Б. Организация и жизнь охранного отделения во времена царской власти / В.Б. Жилинский // Голос минувшего. – 1917. – № 9–10. – С. 247–306.; Членов, С.В. Московская охранка и ее секретные сотрудники / С.В. Членов. – М.: Отдел печати Московского Совета Р. и К.Д., 1919. – 92 с.; Осоргин, М.А. Охранное отделение и его секреты / М.А. Осоргин. – Б.м., 1917. – 32 с.; Падение царского режима. Стенографические отчеты допросов и показаний, данных в 1917 г. в Чрезвычайной следственной комиссии Временного правительства: в 7 т. / под ред. П.Е. Щеголева. Т. 1–7. – М.-Л., 1924–1927.

наступстваў. Сваімі ідэямі ён размежаваў рабочы рух, вымусіўшы рабочых вызначыцца са сваімі пазіцыямі ў адносінах да форм і метадаў барацьбы. Адмова ад «зубатаўшчыны» ў Расійскай імперыі пакінула рабочае пытанне нявырашаным і паспрыяла пачатку Першай расійскай рэвалюцыі [1; 6; 10; 11].

5. У пачатку XX ст. аб'ектам назірання палітычнай паліцыі Расійскай імперыі стаў беларускі нацыянальны рух. Першапачаткова ён разглядаўся жандарамі як частка польскага нацыянальна-вызваленчага альбо агульнарасійскага сацыялістычнага руху. Аднак кантроль нават за дробнымі праявамі антыўрадавай дзейнасці Беларускай сацыялістычнай Грамады быў выдатна арганізаваны, асабліва з 1907 г., бо новыя метады дзейнасці жандараў у час Першай расійскай рэвалюцыі далі магчымасць больш увагі надаваць дробным нацыянальным партыям. БСГ у 1908–1914 гг. як палітычная адзінка амаль не функцыянавала, а «Наша Ніва» і іншыя грамадскія формы актыўнасці беларускай інтэлігенцыі дазваляліся толькі ў межах закону [4; 9; 11].

6. Дзейнасць палітычнай паліцыі ў Беларусі мела шэраг спецыфічных рыс, не характэрных для цэнтральнай часткі Расійскай імперыі. Наяўнасць мяжы ставіла пытанні па барацьбе з эміграцыяй, шпіянажам і кантрабандай нелегальнай літаратуры і зброі. Прыналежнасць значнай часткі грамадства Беларусі да польскай і яўрэйскай нацый, канфесійная неаднароднасць зрабілі актуальным праблему палітычнай лаяльнасці мясцовага насельніцтва да ўраду, папярэджанне сацыяльных канфліктаў на міжнацыянальнай глебе. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1917 гг. вылучылі спецыфічныя задачы па забеспячэнні працы ваеннай цэнзуры, мабілізацыі, эвакуацыі, барацьбе з чуткамі і дэзерцірствам. На тэрыторыі беларускіх губерняў ў канцы XIX – пачатку XX стст. дзейнічала расійская палітычная паліцыя, якая, у значнай ступені з-за ідэалагічных прычын, не ўлічвала ў сваёй дзейнасці мясцовую спецыфіку: у тым ліку пры арганізацыі і камплектаванні мясцовых жандарскіх упраўленняў, распрацоўцы мерапрыемстваў па палітычнаму кантролю за грамадствам. Палітычная паліцыя ў беларускіх губернях у пачатку XX ст. з'яўлялася толькі інструментам рэалізацыі ўрадавай палітыкі і не мела самастойнага статусу як адпаведныя структуры ў Каралеўстве Польскім, Фінляндыі ці на Каўказе [5; 6; 7; 11; 12].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Змешчаны ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны пры распрацоўцы курсаў па гісторыі новага часу Беларусі і Расіі, спецкурсаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху, інтэлігенцыі Беларусі, гісторыі палітычных партый і рухаў у пачатку XX ст. Вынікі даследавання могуць аказаць значную дапамогу ў падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў па згаданых курсах, а таксама манаграфій і даведачна-інфармацыйных выданняў.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках навуковых прац

1. Бусько, С.І. Дэпартамент паліцыі і прафесійны працоўны рух у беларускіх губернях у 1895–1904 гг. / С.І. Бусько // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2010. – № 1. – С. 15–18.

2. Бусько, С.И. Структура и кадровый состав губернских жандармских управлений на территории Беларуси (конец XIX – начало XX в.) / С.И. Бусько // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2010. – С. 9–18.

3. Бусько, С.І. Жандарскія крэпасныя каманды на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С.І. Бусько // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2011. – № 1. – С. 25–29.

4. Бусько, С.І. Палітычны кантроль над беларускім нацыянальным рухам у Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. / С.І. Бусько // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 6 / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2011. – С. 12–19.

## Матэрыялы і тэзісы канферэнцый

5. Бусько, С.І. Дзейнасць палітычнай паліцыі ў Віцебскай губерні ў пачатку XX ст. (1898–1907 гг.) / С.І. Бусько // I Машеровские чтения. 2. Гуманитарные науки. Материалы региональной научной конференции студентов, магистрантов, аспирантов и молодых ученых. 5 мая 2005 г. – Витебск: изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2005. – С. 139–141.

6. Бусько, С.І. Палітычная паліцыя: асоба Я.К. Клімовіча / С.І. Бусько // Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае. Матэрыялы II міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвечанай памяці прафесара В.У. Мелішкевіча. Брэст. 12–13 лістапада 2004 г. / Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна; рэдкал. А.М. Вабішэвіч [і інш.]. – Брест, 2006. – С. 166–170.

7. Бусько, С.И. Эволюция системы государственного контроля в условиях модернизации Российской империи / С.И. Бусько // Сборник научных работ студентов высших учебных заведений Республики Беларусь «НИРС – 2005»: научн. изд. – Минск: РУМЦ ФВН, 2006. – С. 225.

8. Бусько, С.І. Палітычная паліцыя ў нацыянальных рэгіёнах Расійскай імперыі ў 1905–1907 гг. / С.І. Бусько // Шевченківська весна: Матеріали

Міжнародної науково-практичної конференції студентів, аспірантів та молодых вчених, присвяченої 15-й річниці незалежності України. – Вип IV.: У 3-х част. – К.: Логос, 2006. – Ч. 3. Історія / За заг. ред. проф. В.Ф. Колесника. – С. 142–145.

9. Бусько, С.И. Психология погрома в революции 1905–1907 гг. в Беларуси / С.И. Бусько // Инновации – 2006. Материалы XIII Республиканской студенческой научно-практической конференции. Мозырь, 25 апреля 2006 г. – Мозырь, 2006. – С. 260.

10. Бусько, С.И. Несовершеннолетние в революции 1905–1907 гг. (на примере белорусских губерний) / С.И. Бусько // Шевченковская весна. Современное состояние науки: достижения, проблемы и перспективы развития. Материалы V Международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых учёных. – Киев, 2007. – С. 132–134.

11. Бусько, С.І. Палітычная паліцыя ў Беларусі ў 1898–1914 гг. (гістарыяграфія праблемы) / С.І. Бусько // Романовские чтения – 4: сб. трудов Международной науч. конференции / под ред. Я.Г. Риера. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2008. – С. 32–33.

12. Бусько, С.И. Образ жандарма в начале XX в. на территории Беларуси / С.И. Бусько // Проблемы борьбы с преступностью и подготовки кадров для органов внутренних дел Республики Беларусь. Тезисы докладов Международной научно-практической конференции. Минск, 30 июня 2010 г. / М-во внутрен. дел Респ. Беларусь, Акад. МВД; под ред. В.Б. Шабанова. – Минск: Акад. МВД, 2010. – С. 200–201.

13. Бусько, С.І. Арганізацыя і дзейнасць Беластоцкага ахоўнага аддзялення (1904–1910 гг.) / С.І. Бусько // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння І.А. Юхо. Мінск, 18–19 сак. 2011 г. / рэдкал. : С.А. Балашэнка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2011. – С. 174–178.

14. Бусько, С.И. Роль политической полиции в предотвращении событий Февральской революции (на примере белорусских губерний) / С.И. Бусько // Матеріали Міжнародної науково-практичної конференції молодих учених і студентів «Взаємодія і взаємозв'язок Дніпровського Лівобережжя та Курського Посейм'я (археологія, історія, сучасність)». Глухів, 9–10 червня 2011 р. / РВВ ГНПУ ім. О. Довженка; відп. за випуск Я.М. Гирич. – Глухів, 2011. – С. 117–122.

15. Бусько, С.І. Арганізацыя палітычнага нагляду за антыўрадавым рухам у беларускіх губернях у пачатку XX ст.: асноўныя падыходы і метады / С.І. Бусько // «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць»: матэрыялы VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Магілёў, 29 – 30 чэрвеня 2011 г. / Музей гісторыі Магілёва; уклад.: А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. – Мінск, 2011. – С. 23–28.

# РЭЗЮМЭ

**Бусько Сяргей Іванавіч**

**Палітычная паліцыя ў беларускіх губернях: стварэнне, структура, дзейнасць (1898 – сакавік 1917 гг.).**

**Ключавыя словы**: палітычная паліцыя, жандарскае ўпраўленне, ахоўнае аддзяленне, палітычны вышук, палітычныя партыі, «паліцэйскі сацыялізм», перлюстрацыя, правакацыя, шпіянаж, агентура.

**Мэта работы**: выявіць характэрныя рысы і асаблівасці структуры, камплектавання, асноўных метадаў і накірункаў дзейнасці органаў палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях ў 1898 – сакавіку 1917 гг.

**Метады даследавання**: метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання склалі прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызму, дапоўненыя сістэмным і структурна-функцыянальным падыходамі. Выкарыстаны агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, параўнаўчы аналіз, абагульненне, класіфікацыя), спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнаўчы, гісторыка-тыпалагічны, рэтраспектыўны) і метады іншых навук (герменэўтыка, колькасны аналіз).

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** у дысертацыі праведзены глыбокі аналіз гістарыяграфіі і крыніц па гісторыі ўстаноў палітычнай паліцыі. У выніку даследавання вывучаны вопыт палітычнай паліцыі па арганізацыі грамадскага кантролю, прааналізавана іх дзейнасць па прадухіленні рэвалюцыйных сітуацый і ліквідацыі іх наступстваў, а таксама іх роля ў захаванні існаваўшай мадэлі грамадска-палітычнага развіцця Расійскай імперыі. Навуковая навізна працы складаецца ў тым, што ўпершыню на падставе шырокага кола архіўных матэрыялаў праведзена комплекснае даследаванне дзейнасці органаў палітычнай паліцыі ў беларускіх губернях ў 1898 – сакавіку 1917 гг. Грунтоўна асветлены прыярытэтныя напрамкі дзейнасці ўстаноў палітычнай паліцыі (у тым ліку жандарскіх упраўленняў, ахоўных аддзяленняў, крапасных каманд, контрразведкі), а таксама ахарактарызавана іх колькасная і якасная дынаміка, выяўлены і даследаваны рэгіянальныя асаблівасці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі**: вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры выкладанні гісторыі Беларусі, гісторыі палітычных партый у вышэйшых навучальных установах, пры падрыхтоўцы абагульняючых прац і навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, супрацоўнікамі навуковых устаноў, архіваў і музеяў у прафесійнай дзейнасці, для падрыхтоўкі навукова-аналітычных аглядаў, заключэнняў на звароты органаў дзяржаўнага кіравання.

# РЕЗЮМЕ

**Бусько Сергей Иванович**

**Политическая полиция в белорусских губерниях: создание, структура, деятельность (1898 – март 1917 гг.)**

**Ключевые слова**: политическая полиция, жандармское управление, охранное отделение, политический розыск, политические партии, «полицейский социализм», перлюстрация, провокация, шпионаж, агентура.

**Цель работы**: выявить характерные черты и особенности структуры, комплектования, основных методов и направлений деятельности органов политической полиции в белорусских губериях в 1898 – марте 1917 гг.

**Методы исследования**: методологическую основу диссертационного исследования составили принципы объективности и историзма, дополненные системным и структурно-функциональным подходами. Использованы общенаучные (анализ и синтез, индукция и дедукция, сравнительный анализ, обобщение, классификация); специально-исторические методы (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический, ретроспективный) и методы других наук (герменевтика, количественный анализ).

**Полученные результаты и их новизна**: в диссертации проведен глубокий анализ историографии и источников по истории учреждений политической полиции. В результате исследования изучен опыт политической полиции по организации контроля над обществом, проанализирована деятельность по предотвращению революционных событий, а также их роль в сохранении существовавшей модели общественно-политического развития Российской империи. Научная новизна работы заключается в том, что на основе широкого круга архивных материалов проведено комплексное исследование деятельности органов политической полиции в белорусских губерниях в 1898 – марте 1917 гг. Обстоятельно освещены приоритетные направления деятельности органов политической полиции (в том числе жандармских управлений, охранных отделений, крепостных команд, контрразведки), а также охарактеризована их количественная и качественная динамика, выявлены и исследованы региональные особенности.

**Рекомендации по использованию результатов диссертации**: итоги диссертационного исследования могут быть использованы в преподавании истории Беларуси, истории политических партий в высших учебных заведениях, при подготовке обобщающих работ и учебных пособий по истории Беларуси, сотрудниками научных учреждений, архивов и музеев в профессиональной деятельности, для подготовки научно-аналитических обзоров, заключений на обращения органов государственного управления.

## SUMMARY

**Busko Sergey Ivanovich**

**Political police in the Belarusian provinces: formation, structure, activity (1898 – march 1917)**

**Key words**: political police, gendarme department, Okhrana, political search, political parties, «police socialism», perusal, provocation, espionage, secret agents.

**Aim of the work**: the purpose of this dissertation research was to examine defining characteristics and specific features of formation, completion, main methods and directions of political policy activity in Belarusian provinces in 1898 – March 1917.

**Research methods**: methodology has been based on the principles of historicism ad scientific objectivity. The research have been based on general scientific principles (analysis and synthesis, induction and deduction, comparative analysis, generalization, and classification), specific methods of historical analysis (historical genetic, historical comparative, historical systematic, historical typological, retrospective methods).

**Received results and their novelty**: a thorough analysis of historiography and the sources regarding structure and activity of political police in Belarusian provinces in the beginning of XX century has been performed. The research has studied the activity of government's bodies to control social movement, analyzed their activity in revolutionary crisis prevention and mitigation, as well as their role in the development of the new model of organization of political control system and counterintelligence.

Scientific novelty of the work consists in the fact that for the first time on the basis broad audience of archival materials complex research of political police's bodies of Belarusian provinces in 1898 – March 1917. Priority directions of gendarmes' activity in the sphere of state control were thoroughly covered, and were characterized its qualitative and quantitative dynamics, identified and studied the regional characteristics.

**Guidelines for use of results**: the results of this dissertation can be used for teaching history of Belarus, history of political parties in the institutions of higher education. The results of the research can also benefit scholars in their preparation of comprehensive works and textbooks on Belarusian history. The work can also serve as a useful aid in creating scientific analytic reviews by archive and museum specialists as well as a material for petitions at the government level.

